# ЛІЦЭІСТЫ ВДУ – У ЛІКУ ПЕРАМОЖЦАЎ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ

***Напрыканцы сакавіка прайшоў заключны этап рэспубліканскай алімпіяды па 18 вучэбных прадметах. Яго ўдзельнікамі сталі больш за 1500 хлопцаў і дзяўчат з усёй Беларусі. У іх ліку і навучэнцы Ліцэя ВДУ, якія прадставілі Віцебскую вобласць і паказалі выдатныя вынікі. Юлія САЙКО і Кацярына ЗАЙЦАВА атрымалі дыпломы І ступені па рускай мове і літаратуры, а Марыя КАВАЛЁВА – дыплом ІІІ ступені па беларускай мове і літаратуры.***







**Юлія САЙКО,**
**навучэнка 10 «Б» Ліцэя ВДУ:**

– Для мяне перамога на заключным этапе была мэтай, да якой я ішла з восьмага класа. Па выніках першага тура (водгуку) я набрала максімальны бал у рэспубліцы.

Хочацца падзякаваць нашаму настаўніку Уладзіміру Максімавічу Генкіну і дэкану факультэта гуманітарыстыкі і моўных камунікацый Сяргею Уладзіміравічу Нікалаенка. Таксама я вельмі ўдзячная дырэктару Ліцэя ВДУ Наталлі Уладзіміраўне Шчагловай, якая хвалявалася за кожнага алімпіядніка і маральна падтрымлівала нас.

Насамрэч, заданні заключнага этапу мне падаліся больш лёгкімі ў параўнанні з папярэднімі. Магчыма, дапамагла шматдзённая трэніроўка.

Дарэчы, рыхтавацца да алімпіяды мне падабалася, я рабіла ўсе заданні па рускай мове і літаратуры з задавальненнем. Гэтак жа і з водгукам. Лічу, што асэнсоўваць унутраны свет верша цікава і захапляльна.

**Кацярына ЗАЙЦАВА,**
**навучэнка 10 «Г» Ліцэя ВДУ:**

– Пры вывучэнні рускай мовы павышаецца ўзровень пісьменнасці і культуры, пашыраецца кругагляд. А ўдзел у алімпіядах спрыяе новым знаёмствам. Перамога ж дае льготы пры паступленні ва ўніверсітэт.

Я б ацаніла, што заданні заключнага этапу былі сярэдняга ўзроўню складанасці, таму з лінгвістычнай часткай я добра справілася. Хвалявалася больш за водгук, бо, як мне падалося, напісаць якасны аналіз верша за 4 гадзіны было цяжка.

На мой погляд, самае складанае ў падрыхтоўцы да алімпіяды – вялікая колькасць інфармацыі. Цяжка сканцэнтравацца на чымсьці, бо ніколі не ведаеш, што менавіта можа спатрэбіцца.

Гэтая перамога – вынік не толькі маёй працы, але і ўклад многіх людзей. Хочацца падзякаваць Уладзіміру Максімавічу Генкіну і Ганне Аляксандраўне Гладковай, а таксама кіраўніцтву Ліцэя ВДУ за дапамогу.

**Марыя КАВАЛЁВА,**
**навучэнка 10 «Г» Ліцэя ВДУ:**

– Падчас падрыхтоўкі да алімпіяды важна не толькі канцэнтравацца на адным прадмеце, але і ўдзяляць увагу іншым заняткам. Невядома, што табе можа спатрэбіцца. Напрыклад, мне на алімпіядзе дапамаглі веды па гісторыі і нават па матэматыцы. Было заданне падлічыць колькасць косак пры аднародных членах і падставіць у формулу. Не ўсе ўдзельнікі з гэтым справіліся!

Вялікі дзякуй за працу і падтрымку маёй настаўніцы Алене Сяргееўне Дзядовай, якая вельмі хвалявалася за мяне, кожны дзень мы былі на сувязі. Шчыра дзякую і любімаму дырэктару Ліцэя ВДУ Наталлі Уладзіміраўне Шчагловай, а таксама Іне Леанідаўне Вазнюк, Валянціне Андрэеўне Крук.

Лічу, што любоў да роднага слова, падтрымка родных і сяброў і дапамаглі мне ўвайсці ў тройку лідэраў.

**Алена ДЗЯДОВА,**
**кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры моваэнаўства:**

– Перамога Марыі на заключным этапе рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры чаканая і невыпадковая, бо Маша – выдатніца і разумніца. Яна адказна ставіцца да вывучэння ўсіх прадметаў, а не толькі філалагічнага профілю.

Думаю, што атрыманне дыплома ІІІ ступені – гэта найперш яе заслуга. Марыя вельмі падрыхтаваная і ўдумлівая, старанная і арганізаваная, шмат часу аддае самападрыхтоўцы. Абсяг яе моваэнаўчых і літаратуразнаўчых ведаў надзвычай шырокі. Часам здаецца, што дзяўчына інтуітыўна адчувае, што я, як выкладчык, хачу бачыць і чуць ад яе.

Што датычыцца маёй працы ў ліцэі, скажу так: працаваць з навучэнцамі найперш цікава. Але, як і са студэнтамі, вельмі адказна. Сваю задачу як настаўніка бачу не толькі ў тым, каб мае дзесяцікласнікі дасканала авалодалі беларускай мовай, але і ў тым, каб яны з цягам часу не адвярнуліся ад яе, каб разумелі, што родная мова – гэта падмурак, частка этнічнага самаўсведамлення, нацыянальнай культуры і прадмет гонару народа.

**Уладзімір ГЕНКІН,**
**кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры моваэнаўства:**

– Я лічу, каб выдатна падрыхтавацца да алімпіяды, трэба працаваць пастаянна. Таму мы пачалі гэта рабіць яшчэ ў верасні. Шмат займаліся на факультатыўных занятках, разбіралі заданні мінулых гадоў. Але трэба разумець, што Юлія і Кацярына ўжо маюць вопыт удзелу ў алімпіядах. Яшчэ падчас вучобы ў школе яны былі ў ліку пераможцаў рэспубліканскага этапу. Таму варта сказаць дзякуй настаўнікам, якія займаліся з імі раней, бо вопыт – вельмі важная рэч!

Руская мова і літаратура – гэта не тыя прадметы, якія можна проста вывучыць. Алімпіяда складаецца з двух этапаў. Першы – напісанне водгуку на літаратурны твор з пэўнымі патрабаваннямі. Трэба зрабіць аналіз, знайсці вобразныя сродкі, якія выкарыстоўвае аўтар, і г.д. А гэта патрабуе шырокага чытацкага кругагляду і эрудыцыі.

Другі этап – комплексная работа, якая ўключае 12 разнастайных заданняў (8 – лінгвістычных, 4 – літаратурныя).

Алімпіяда – гэта не проста праверка ведаў. Важна ўмець лінгвістычна мысліць, а таксама нестандартна вырашаць розныя пытанні.

**Алеся МЯДЗІЛЬ.**
**Здымкі Наталлі ТАРАРЫШКІНАЙ.**